Источник: "Настаўніцкая газета" - 2020-12-24

# Вопыт каманднай работы ў матэматычных баях

**Нядаўна ў сталіцы былі падведзены вынікі XXII Рэспубліканскага турніру юных матэматыкаў, якія адбыўся на базе Мінскага абласнога інстытута развіцця адукацыі ў дыстанцыйным фармаце.**

Турніры юных матэматыкаў існуюць у нашай краіне амаль чвэрць стагоддзя: першыя пробныя спаборніцтвы прайшлі яшчэ ў 1995 годзе. На аснове правіл беларускага турніру сфарміраваны правілы міжнароднага турніру юных матэматыкаў. Дарэчы, на апошнім з іх наша каманда заваявала бронзавыя медалі. Усяго ў скарбонцы беларусаў 7 залатых, 4 сярэбраныя і 4 бронзавыя медалі.

Якія асаблівасці мае турнір? Па-першае, гэта спаборніцтвы навучэнцаў ва ўменні рашаць матэматычныя задачы даследчага характару, пісьменна і пераканаўча прадстаўляць атрыманыя вынікі, аргументавана адстойваць свой пункт гледжання ў публічных дыскусіях. Па-другое, турнір праходзіць у выглядзе паслядоўных матэматычных баёў, у якіх каманды па чарзе прадстаўляюць свае даследаванні па прапанаваных заданнях, а таксама выступаюць у ролі апанентаў для іншых удзельнікаў. Прыняць удзел у спаборніцтвах можа любая каманда, якая складаецца не больш чым з шасці навучэнцаў і кіраўніка і ў дастатковай меры падрыхтуе не менш за сем даследчых заданняў з ліку прапанаваных журы. Каманда таксама можа складацца з навучэнцаў розных класаў агульнаадукацыйнай установы або курсаў прафесійна-тэхнічнай або сярэдняй спецыяльнай установы адукацыі (дапускаецца зборная ўстаноў адукацыі, раёна, горада і г.д., сабраная на базе адной з устаноў адукацыі).

Сёлета ў турніры ўдзельнічала 16 каманд з Брэсцкай, Віцебскай, Гомельскай, Гродзенскай, Мінскай абласцей і Мінска. Усяго ж выказалі жаданне прыняць удзел 20 каманд, якія прайшлі папярэдні адбор.

У сувязі з правядзеннем турніру ў анлайн-фармаце ажыццяўлялася панарамная здымка з відэа- і аўдыяназіраннем за работай навучэнцаў. Падчас кожнага матэматычнага бою ўсе дзеянні каманд (даклад, дыскусія, пытанні журы) дэманстраваліся на экранах манітораў і пры неабходнасці праецыраваліся на вялікі экран, каб усе маглі назіраць і прымаць удзел у дыскусіі.

Ацэньвала работу юных матэматыкаў кампетэнтнае журы пад кіраўніцтвам загадчыка аддзела дыферэнцыяльных ураўненняў Інстытута матэматыкі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктара фізіка-матэматычных навук, прафесара Яўгена Канстанцінавіча Макарава.

На думку журы, усе ўдзельнікі турніру былі якасна падрыхтаваны да вядзення матэматычных дыскусій. Навучэнцы ў залежнасці ад выбранай ролі (дакладчыка, апанента, рэцэнзента, назіральніка) падчас дыскусій прадэманстравалі камунікатыўныя і даследчыя кампетэнцыі. Журы адзначыла добры ўзровень прадметных кампетэнцый навучэнцаў па рашэнні задач даследчага характару.

Удзельнікі і пераможцы турніру ўзнагароджаны пахвальнымі водзывамі, дыпломамі і каштоўнымі IT-падарункамі. У цырымоніі ўзнагароджання пераможцаў і закрыцці мерапрыемства прынялі ўдзел першы прарэктар Мінскага абласнога інстытута развіцця адукацыі, кандыдат педагагічных навук, дацэнт А.М.Змушко, прафесар Інстытута матэматыкі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі доктар фізіка-матэматычных навук Я.К.Макараў, намеснік дэкана факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт Б.В.Задворны.

Дыпломы I ступені заваявалі **каманда Ліцэя Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (каманда "Ліцэй БДУ — 1") і каманда гімназіі № 29 Мінска**, дыпломамі II ступені ўзнагароджаны **каманда гімназіі № 41 Мінска імя В.Х.Сярэбранага і зборная каманда ўстаноў адукацыі Мінскай вобласці** (Мінскі дзяржаўны абласны ліцэй, Бараўлянская гімназія, гімназія № 1 імя В.А.Караля Чэрвеня), дыпломамі III ступені — **каманда Ліцэя Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (каманда "Ліцэй БДУ — 3"), зборная каманда ўстаноў адукацыі Гомеля** (гімназія № 56 імя А.А.Вішнеўскага, гімназія № 51, гімназія № 71, сярэдняя школа № 8, сярэдняя школа № 30, Рэчыцкі раённы ліцэй) і **зборная каманда № 2 устаноў адукацыі Мінска** (гімназія № 7, гімназія № 13, гімназія № 20, сярэдняя школа № 37, гімназія № 37, гімназія № 146).

Сярэбраным прызёрам турніру стала зборная каманда ўстаноў адукацыі Мінскай вобласці. За яе выступалі Ягор Савянок і Кірыл Бабко з Бараўлянскай гімназіі, Аляксей Шаўкуноў і Аляксандр Рабачэўскі з МДАЛ, Сабіна Аліева і Паліна Лупянкова з гімназіі № 1 Чэрвеня. Кіраўнікі зборнай — настаўнікі матэматыкі Ала Браніславаўна Шабан з Бараўлянскай гімназіі, Ілья Раманавіч Фрыдман з МДАЛ і Наталля Уладзіміраўна Пабойкіна з гімназіі № 1 Чэрвеня.

— На рэспубліканскім узроўні мы ўпершыню выступаем як зборная. На вобласці кожная з каманд была сама за сябе, — расказалі кіраўнікі зборнай. — Пасля абласнога этапу было прынята рашэнне аб'ядаць сілы трох устаноў адукацыі і сфарміраваць зборную з лепшых навучэнцаў кожнай з іх. Ва ўсіх навучэнцаў ёсць вопыт удзелу ў падобным турніры, некаторыя з іх ужо прадстаўлялі свае ўстановы на рэспубліцы. Дзякуючы турніру, юныя матэматыкі набываюць вопыт каманднай работы, вучацца прыгожа гаварыць, правільна фармуляваць свае думкі, аргументаваць іх, становяцца больш разняволенымі.

**Наталля КАЛЯДЗІЧ.**
*kaliadich@nastgaz.by*